

Лішняя вага забівае печань

СТАР. 5



Дзмітрый Дашчынскі: пра фрыстайл і не толькі

СТАР. 6



Мінскі паліглот размаўляе на 18 мовах

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 САКАВІКА 2016 г. СЕРАДА № 53 (28163) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## БЕЛАРУСЬ — ГРУЗІЯ: СУПРАЦОЎНІЦТВА ВА ЎСІХ СФЕРАХ

**Пра гатоўнасць дзвюх краін пашыраць кантакты па ўсіх напрамках ішла размова на сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Грузіі Георгія Квірыкашвілі.**



Фота БЕЛТА.

У час сустрэчы былі абмеркаваны перспектывы ўзаемадзеяння ў розных сферах, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. У гандлёва-эканамічнай, у прыватнасці, сярод найважнейшых задач пазначана дасягненне тавараразвароту ў $200 млн. На думку Аляксандра Лукашэнкі, гэта першы крок, які Беларусь і Грузія павінны зрабіць у бліжэйшы час. Да гэтага часу бакі паспелі добра вывучыць магчымасці і патрэбы адзін аднаго ў частцы ўзаемных паставак. Вялікая ўвага нададзена развіццю супрацоўніцтва ў прамысловасці, у тым ліку стварэнню сумесных вытворчасцяў.

Як неаднаразова падкрэслівалася падчас сустрэчы, значны імпульс развіццю двухбаковых адносін надаў афіцыйны візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Грузію ў красавіку 2015 года. Тады бакі, ацаніўшы значнасць патэнцыялу супрацоўніцтва, дасягнулі вялікай колькасці дамоўленасцяў. Над іх рэалізацыяй працуюць цяпер урады дзвюх краін. Беларускі бок, як запэўніў кіраўнік дзяржавы, ад гэтага курсу не адступіць.

Цяперашні візіт Георгія Квірыкашвілі ў Беларусь Аляксандр Лукашэнка назваў не проста знакавым. Паводле слоў беларускага лідара, гэта сведчанне сур'ёзных намераў Грузіі ўмацоўваць адносіны з Беларуссю. Грузінскі бок у сваю чаргу бачыць велізарны прагрэс ва ўсіх сферах узаемадзеяння з Беларуссю і накіраваны на прасоўванне канкрэтных праектаў.

Прэзідэнт канстатаваў, што ў Беларусі і Грузіі практычна няма разыходжанняў у знешняй палітыцы. «Усё роўна, які курс узяла Грузія і якога прытрымліваемся мы. Гэта нам не перашкаджае выбудоўваць адносіны», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Краіны адсочваюць падзеі, працэсы, якія адбываюцца ў свеце, і гатовы з іх улікам карэктаваць узаемадзеянне, але, як падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы, толькі ў бок паляпшэння.

# СПРАВА ТЭХНІКІ



Фота БЕЛТА.

Малады выкладчык Маларыцкага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці Антон ТАЛАШКА мае цікавае захапленне. Ён аднаўляе па фрагментах нацыянальны арнамент у спецыяльнай камп'ютарнай праграме, пасля ўносіць яго ў памяць вышывальнай машыны, і тая вышывае патрэбны ўзор на тканіне. Цяпер Антон займаецца аблічбоўкай усіх магчымых арнаментаў маларыцкага строю — аднаго з самых багатых на аздобу відаў народнага касцюма. А ў планах у хлопца — заняцца і нацыянальнымі арнаментамі з іншых рэгіёнаў краіны.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Сямён ШАПІРА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«Разгляд зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб лічу адным з асноўных кірункаў работы аблвыканкама і яго кіраўніцтва. Звароты, якія паступаюць у ходзе асабістых прыёмаў, часта становяцца крыніцай інфармацыі пра існуючыя праблемы. Аднак недапушчальна, калі людзі з кожнай нагоды звяртаюцца ў аблвыканкам і вышэйстаячыя арганізацыі: большасць пытанняў можна і трэба вырашаць на месцах. Мы імкнёмся да таго, каб нашы дзеянні былі правамерныя і планамерныя. Гэта азначае, што ў ходзе прыёмаў не даецца даручэнняў аб рашэнні пытанняў спосабамі, якія супярэчаць заканадаўству, не раздаюцца неапраўданыя абяцанні».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20219,00 | ▼ |
| Еўра | 22686,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 297,51 | ▲ |
| Укр. грыўня | 776,91 | ▲ |

■ Партнёры

## ВЫЙСЦІ НА ІНШЫ ЎЗРОВЕНЬ

**Наша краіна зацікаўлена ў развіцці прамысловай кааперацыі з Грузіяй. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ падчас сустрэчы з грузінскім калегам Георгіем Квірыкашвілі. Паводле яго слоў, «сёння склаліся спрыяльныя ўмовы для больш высокага ўзроўню развіцця двухбаковых узаемаадносін».**

Адным са знакавых праектаў, на думку прэм'ер-міністра, з'яўляецца стварэнне зборачнай вытворчасці беларускай трактарнай тэхнікі. Па словах Андрэя Кабякова, Беларусь разлічвае, што рэалізацыя гэтага праекта будзе спрыяць забеспячэнню сельскагаспадарчых вытворцаў Грузіі новай высокапрадукцыйнай тэхнікай і паскарэнню мадэрнізацыі сельгасгаліны. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што Беларусь разглядае Грузію як перспектыўнага гандлёва-эканамічнага партнёра ў Каўказскім рэгіёне.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## ДА НОВЫХ ВЯРШЫНЯЎ

**«Па лініі парламента — Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў — мы зробім усё неабходнае, каб стварыць камфортныя ўмовы па рэалізацыі тых высокіх дамоўленасцяў, якія адбыліся ў працэсе вашага візіту», — заявіў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі, падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Грузіі Георгіем Квірыкашвілі.**

На сустрэчы прысутнічалі старшыні абедзвюх палат беларускага парламента. Спікер верхняй станоўча ацаніў сумесную працу нашых краін. «Вялікі рэзерв нам бачыцца ў развіцці рэгіянальнага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

«Нашы народы заўжды адрознівала сяброўства, працалюбства, гасціннасць, — адзначыў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў.** — Мы імкнёмся развіваць нашы сувязі. З 2009 года актыўна супрацоўнічаем па ініцыятыве ад Еўрапейскага саюза (Усходняга партнёрства)».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Круглы стол

## Змены ў пенсійнай сістэме: няпростыя, але неабходныя,

### або У «залатым» узросце ўсё толькі пачынаецца

**Павышэнне пенсійнага ўзросту — справа для краіны непазбежная, гэта пасля нарады ў Прэзідэнта зразумелі ўсе. Тэма абмяркоўваецца ў паліклініках, на прыпынках грамадскага транспарту, на кухні... Мы таксама стараемся трымаць руку на пульсе. Штодзень са старонак газеты гучаць думкі простых людзей, экспертаў. А напрыканцы мінулага тыдня ў нашу рэдакцыю завіталі на «круглы стол» Аляксандр ВАЛЧАНКОЎ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях; Алена ГОМАРАВА, начальнік упраўлення пенсійнага заканадаўства галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны; Ганна ЗАКРЭЎСКАЯ, начальнік аддзела даследаванняў рынку працы, занятасці і сацыяльнай абароны насельніцтва Навукова-даследчага інстытута працы, член Бюро працоўнай групы па пытаннях старэння ААН; Вольга ШЫШЛО, кіраўнік навучальных напрамкаў Універсітэта трэцяга ўзросту. Спецыялісты гаварылі не толькі пра тое, чаму ўзнікла неабходнасць змен у пенсійнай сістэме і на што варта звяртаць увагу, праектуючы гэтыя змены на рынак працы, але і пра псіхалогію беларусаў, пра стэрэатыпы, ад якіх настаў час адмовіцца.**

СТАР. 3

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях




## ЧАС НАВОДЗІЦЬ ПАРАДАК

### Як правільна ўтылізаваць на прыватным падворку смецце і сухую расліннасць?

**Сакавік і красавік — час, калі над прыватнымі падворкамі пачынае курэць. Гэта сімвал таго, што тамтэйшыя гаспадары імкнуцца навесці парадак на сваёй тэрыторыі. Але, як той казаў, добрымі намерамі выбрукавана дарога ў пекла. У нашым выпадку гэтыя словы маюць літаральны сэнс. Толькі летась больш за пятнаццаць чалавек загінулі ад веснавых пажараў у экасістэмах.**



### ХАЦЕЎ СПАЛІЦЬ СМЕЦЦЕ — ЛЕДЗЬ НЕ ЗНІШЧЫЎ ВЁСКУ

— Мінулая засушлівая вясна была вельмі «гарачай» для нас, — згадвае **памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — У асобныя дні ратаўнікі выязджалі тушыць сухую расліннасць і смецце да 150 разоў на суткі! А ўсяго за сакавік 2015-га колькасць такіх узгаранняў пераваліла за паўтары тысячы. Цёплыя і маласнежныя зімы спрыяюць таму, што апошнія тры гады сезон пажараў у экасістэмах пачынаецца яшчэ да вясны. Сёлета «лік адкрыў» Зэльвенскі раён, дзе тушыць палаючую траву ратаўнікі выязджалі 6 лютага. А вось у 2013 годзе, калі зіма была снежная і да таго ж пашчыраваў незабыўны «Хаўер», да красавіка мы з такімі пажарамі не сутыкаліся ўвогуле. Ды і ў тым месяцы іх было толькі 409, што рэзка кантрастуе з леташнім сакавіцкім паказчыкам... Сёлета ж становішча больш ціхае. Але невядома, якія сюрпрызы рыхтуе надвор'е ў красавіку.

СТАР. 3



**Стары свет зноў зазнаў тэрарыстычныя атакі — учора выбухі прагрымелі ў Бруселі, сталіцы Бельгіі і, па факце, — Еўрасаюза. Здавалася б, «пятніца 13-га» ў Парыжы павінна была прывесці ў поўную баявую гатоўнасць службы бяспекі не толькі Францыі, але і яе суседзяў. На жаль, ці то праз чатыры месяцы пільнасць спецслужбаў пачала падаць, ці экстрэмісты аказаліся лепей падрыхтаванымі, але трагедыя паўтарылася.**

## СЛЁЗЫ БРУСЕЛЯ СТУКАЮЦЬ У СЭРЦЫ...

### Выбухі ў бельгійскай сталіцы скалыхнулі ўвесь свет

Першыя выбухі прагрымелі ў міжнародным аэрапорце Бруселя Завентэм а восьмай раніцы па мясцовым часе. Спачатку пра тое, што гэта з'яўляецца вынікам тэракта, прама не паведамлялася. Прыкладна аб 11 гадзіне раніцы з'явілася інфармацыя пра выбухі ў брусельскім метро. Пасля гэтага ўлады Бельгіі афіцыйна прызналі, што адбыліся тэракты. Узровень тэрарыстычнай пагрозы ў краіне дасягнуў максімальнага.

Прыкладна ў гэты ж час з'явілася інфармацыя пра тое, што ў аэрапорце можа заставацца некалькі выбуховых прыстасаванняў. У выніку пошукавых дзеянняў на месцы ўзрываў былі знойдзены тры паясы смяротнікаў.

У другой палове дня прэм'ер-міністр краіны Шарль Мішэль заявіў, што адбылося тры выбухі. Два з іх — у аэрапорце, адзін — у метро на станцыі «Мальбек».

Звесткі аб загінулых і параненых увесь дзень змяняліся. Каля 16 гадзін паведамілі пра 34 забітых і больш чым 200 параненых.

У той жа час з'явілася інфармацыя, што адказнасць за тэракты ў сталіцы Бельгіі ўзяла на сябе Ісламская дзяржава. Амаль ва ўсіх еўрапейскіх сталіцах быў уведзены стан павышанай небяспекі, у аэрапортах павышаны меры па прадухіленні тэрарыстычнай пагрозы. Прэм'ер-міністр Францыі Мануэль Вальс заявіў, што Еўропа знаходзіцца ў стане вайны супраць тэрарыстаў.



Беларускае знешнепалітычнае ведамства амаль адразу, як толькі з'явілася першая інфармацыя пра выбухі, пачало працу па высвятленні, былі ці не сярод ахвяр тэрактаў грамадзяне нашай краіны. Праз свой твітар-акаўнт МЗС парэкамендавала ўсім грамадзянам нашай краіны, што знаходзяцца ў Бруселі, пазбягаць грамадскіх месцаў і не карыстацца грамадскім транспартам. Там жа размясцілі тэлефоны нашага пасольства ў Бруселі, каб усе, чые родзічы цяпер у Бельгіі і не выходзяць на сувязь, маглі звязацца па іх з дыпламатамі. У Бельгіі аб'яўлена трохдзённая жалоба.

Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні і словы падтрымкі каралю Бельгіі Філіпу, а таксама ўсяму бельгійскаму народу. «З вялікім болем успрынялі ў Беларусі вестку аб шматлікіх чалавечых ахвярах у выніку тэрарыстычных актаў, якія адбыліся ў Бруселі 22 сакавіка», — гаворыцца ў спачуванні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**



ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

■ Блізкая ўлада

# КЛОПАТЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ І АЎТОБУС У ВЁСКУ


Фота БЕЛТА.

**На «прамую лінію» да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА ў мінулую суботу змаглі дазваніцца 32 чалавекі. Узнятыя пытанні паслужылі своеасаблівым зрэзам праблем, якія найбольш хвалююць насельніцтва і з'яўляюцца надзвычай актуальнымі для цяперашняга часу.**

Адным з першых да губернатара дазваніўся індывідуальны прадпрымальнік з Лунінца. Іван Ярмашэвіч 14 гадоў таму ўзяў у арэнду памяшканне ў багажным аддзяленні чыгуначнай станцыі пад гандлёвы аб'ект. За гэты час чалавек затраціў нямала сродкаў на рамонт і добраўпарадкаванне. Расказаў, што паставіў сігналізацыю, набыў камеру назірання, наладзіў ацяпленне. Апошні раз дагавор арэнды бакі падпісалі ў 2013 годзе на тры гады тэрмінам да 31 кастрычніка 2016 года. І раптам Ярмашэвічу аб'явілі, што ён павінен з'ехаць на працягу месяца, бо ў багажным аддзяленні запланаваны рамонт. А як жа дагаворныя абавязацельствы, укладзеныя сродкі? — не можа зразумець прадпрымальнік.

Сапраўды, непрыгожа атрымліваецца. З аднаго боку, на ўсіх узроўнях гаворыцца, што трэба ўсяляк падтрымліваць прыватную ініцыятыву як крыніцу рабочых месцаў, а з другога — маем вось такія праблемы. Службовыя асобы атрымалі даручэнне праверыць сігнал і паспрыяць вырашэнню праблемы: калі нельга пакінуць гандлёвы пункт, то чыгунка павінна будзе кампенсаваць прадпрымальніку страты з прычыны парушэння ўмоў дагавора арэнды і ўкладзеныя сродкі.

Яшчэ адзін прадпрымальнік з Пінска скардзіўся на вялікія штрафы за дробныя парушэнні. Ігар Махнавец і яго калегі, якія рамантуюць машыны, трапілі нядаўна ў складаную сітуацыю з-за таго, што своечасова не зарэгістраваліся ў адзіным рэестры бытавых паслуг. Праз гэта на іх не толькі наклалі штраф, але і прынялі рашэнне аб канфіскацыі выручкі за час пасля пратэрмінаванай рэгістрацыі. У Ігара Мікалаевіча гэтая выручка склала 90 мільёнаў рублёў, у іншых рамонтнікаў даходзіць да 300 мільёнаў. Але ж выручка — гэта не даход. І яе канфіскацыя азначае разарэнне і даўгі. Заяўнік перакананы, што пакаранне ў гэтым выпадку не адпавядае парушэнню, паводле яго слоў, «многія калегі проста ў паніцы». Губернатар параіў прадпрымальніку сабраць неабходныя дакументы і звярнуцца ў абласную камісію па разглядзе спрэчных пытанняў. Гэтая камісія накіруе дакументы ў адпаведны рэспубліканскі орган, дзе ўважліва разгледзяць іх заяву.

Па-ранейшаму шмат пытанняў датычылася фінансавання жылля для вясковых жыхароў. Тэлефанавалі ў асноўным шматдзетныя бацькі са скаргамі на недастатковае крэдытаванне будаўніцтва. Яшчэ вясковыя жыхары прасілі адрамантаваць дарогі, упарадкаваць работу магазінаў. А стараста вёскі Ячкавічы Іванаўскага раёна ад імя жыхароў прасіла наладзіць транспартныя зносіны з Пінскам. У Пінску вучыцца нямала дзяцей вяскоўцаў, людзям трэба дабірацца ў бальніцу альбо паліклініку, ды нават на рынак альбо ў вялікія крамы з'ездзіць перыядычна ўзнікае патрэба. Аўтобус жа заязджае ў вёску толькі раз на тыдзень у пятніцу вечарам і зваротным рэйсам — у нядзелю ўвечары. Вера Васільеўна прапануе не адкрываць новы рэйс (яго яшчэ раней прызналі нерэнтабельным), а арганізаваць заезд. Напрыклад, недалёка праходзіць аўтобус Пінск — Опаль, якому давядзецца збочыць 7 кіламетраў па асфальтаванай дарозе, альбо мікрааўтобус Пінск — Дубае, які ідзе ў пяці кіламетрах ад вёскі. І гэта сапраўды вельмі важнае для людзей пытанне.

Як і выпас асабістага статка, на адсутнасць якога скардзіўся 76-гадовы пенсіянер з вёскі Верхалессе Кобрынскага раёна. Пажылы чалавек расказваў, як штогод у вёсцы становіцца менш кароў, бо пасвіць іх даводзіцца за пяць кіламетраў ад населенага пункта, а раней паша выдзялялася побач. Калі справа выглядае менавіта так, то гэта зусім непарадак, лічыць кіраўнік вобласці: ён адразу даручыў выехаць на месца адказным работнікам і разабрацца з сітуацыяй.

Было некалькі пытанняў, якія, здавалася б, не ў кампетэнцыі губернатара, але ж вельмі хвалююць людзей, таму ўсё роўна службовыя асобы атрымалі заданне вывучыць альбо пераправерыць яшчэ раз. Пенсіянерка з Іванава наракала на рост кошту лекаў. Яна прыводзіла прыклады па канкрэтных прэпаратах беларускай вытворчасці, якія менш чым за месяц у іх аптэцы прыбавілі больш чым на 40 працэнтаў. А калі гэта лекі для пастаяннага прыёму, а пенсія малая, то цалкам зразумела, чаму жанчына пастаралася дазваніцца на «прамую лінію» і падзяліцца сваім клопатам. Як і маці васьмярых дзяцей Марыя Малей са Столінскага раёна, у якой атрымалася вельмі малая пенсія. Жанчына сцвярджае, што працавала з 1971-га па 2002 год з перапынкамі на выхаванне дзяцей. Як аказалася, працоўнага стажу для пенсіі не хапіла, ёй налічылі пенсію толькі як шматдзетнай маці, з чым яна не пагаджаецца.

Пазванілі адразу два прадстаўнікі адной грамадскай арганізацыі — савета ветэранаў ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння. Іх пытанні-прапановы датычыліся ўвекавечання памяці аб гістарычных падзеях на карысць патрыятычнаму выхаванню. Гаворка ішла і пра тое, каб папоўніць Пружанскі музей ваеннай тэхнікі ракетай Р-12, якая знаходзіцца ў распілаваным выглядзе на тэрыторыі адной з вайсковых часцей. Адзначана, што прапанова заслугоўвае ўвагі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ЗАПЫТАЙЦЕСЯ — І ВАМ АДКАЖУЦЬ!

У гэтую суботу ўлады традыцыйна выйдуць на сувязь з жыхарамі краіны

Такі спосаб зносін доўжыцца з зімы 2015 года і, як паказвае практыка, вельмі папулярны сярод жыхароў нашай краіны. Спецыялісты адзначаюць, што за час свайго існавання прамыя лініі паспелі змяніць прынцып узаемадзеяння паміж выканаўчай уладай на месцах і людзьмі. Цяпер грамадзяне не толькі просяць разабрацца ў складаных сітуацыях, але і актыўна ўносяць прапановы.

**У гэтую суботу, 26 сакавіка, з 9.00 да 12.00 на сувязь з насельніцтвам выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам** — першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васілевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** — намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам** — кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам** — першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам** — першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам** — намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

## ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

Учетный номер плательщика: 690 277 551
Организационно-правовая форма: частная
Единица измерения: млн рублей
Адрес: **222132, Минская обл., Борисовский р-н, д. Веселово, ул. Заводская-24**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 39 292 | 38 969 |
| Нематериальные активы | 120 | 18 | 2 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 962 | 1 964 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **41 272** | **40 935** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 11 224 | 9 425 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 6 118 | 6 350 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 506 | 714 |
| готовая продукция и товары | 214 | 4 600 | 2 361 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 35 | 135 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 9 010 | 11 740 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 7 | 211 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **20 276** | **21 511** |
| **БАЛАНС** | **300** | **61 548** | **62 446** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 11 441 | 11 441 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 61 | 61 |
| Добавочный капитал | 450 | 31 388 | 31 388 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (13 104) | (7 701) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | - |
| Целевое финансирование | 480 | | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **29 786** | **35 189** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | | 702 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **702** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 10 008 | 11 000 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 21 754 | 15 555 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 9 688 | 7 834 |
| по авансам полученным | 632 | 697 | 1 262 |
| по налогам и сборам | 633 | 7 574 | 2 448 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 113 | 80 |
| по оплате труда | 635 | 322 | 291 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 3 360 | 3 640 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **31 762** | **26 555** |
| **БАЛАНС** | **700** | **61 548** | **62 446** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 24 354 | 25 615 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 20 067 | 18 983 |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 4 287 | 6 632 |
| Управленческие расходы | 040 | 7 254 | 6 671 |
| Расходы на реализацию | 050 | 901 | 966 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | (3 868) | (1 005) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 8 | 5 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 209 | 542 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | (4 069) | (1 542) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 22 | 88 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 22 | 88 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 4 | 150 |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 4 | 150 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 14 | 8 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 14 | 8 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 1 366 | 4 238 |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | 101 | 2 707 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | 7 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 1 265 | 1 524 |
| Иные доходы и расходы | 140 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130±140) | 150 | (1 334) | (4 292) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±150) | 160 | (5 403) | (5 834) |
| Налог на прибыль | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 180 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (±160-170±180±190-200) | 210 | (5 403) | (5 834) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | | |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | (5 403) | (5 834) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | | |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель В.В.Лейбук

Главный бухгалтер А.В.Петрович

По заключению аудиторской организации ООО «АудитБизнесКонсалт», бухгалтерская отчетность ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» на 31 декабря 2015 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

■ Свая справа

# «ІНКУБАТАР»... ІДЭЙ

## На Гродзеншчыне ствараецца першы ў краіне аграпрамысловы парк дзеля развіцця фермерства

**Прэзідэнцкім Указам «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь» ставіцца задача паскоранага развіцця малога і сярэдняга бізнесу, уключэння яго ў экспартную дзейнасць і імпартазамяшчэнне, у тым ліку з прыцягненнем замежнага капіталу. Адзін з праектаў у гэтым кірунку нядаўна стартаваў на Гродзеншчыне: ствараецца першы ў краіне аграпрамысловы парк з мэтай падтрымкі прыватных сельгасвытворцаў рэгіёна.**


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Таццяна і Міхаіл ЧЫСЦЯКОВЫ: «Верым, што гэты праект будзе паспяховым!»**

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у фермерскай гаспадарцы «Райская даліна», на базе якой ажыццяўляецца гэты праект ЮНІДА. Разам з ёй у стварэнні аграпрамысловага парка ўдзельнічаюць Гродзенскі аблвыканкам, Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт і абласная асацыяцыя фермераў. На першапачатковым этапе інвестыцыі складуць 980 тысяч долараў.

### ГРЫБЫ... НА ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

**Гаспадары «Райскай даліны» Таццяна і Міхаіл ЧЫСЦЯКОВЫ** пазнаёміліся, а затым стварылі сям'ю дзякуючы захапленню спортам — грэбляй на байдарках і каноэ. А жаданне зрабіць сямейнам бізнесам фермерства ўзнікла ў іх даволі нечакана.

— Муж на дзень нараджэння ў лютым падарыў мне... грыбы, якія сам вырасціў у падвале. З гэтага і пачалося, — кажа Таццяна Чысцякова.

З Чысцяковымі мы сустрэліся непадалёк ад вёскі Зарыца, што літаральна побач з абласным цэнтрам. Тут у распараджэнні «Райскай даліны» два гектары зямлі, а яшчэ дзесяць — на тэрыторыі Азёрскага сельсавета. Кірункаў дзейнасці ў фермерскай гаспадаркі зараз некалькі. Асноўны — вырошчванне трусоў, прычым не ў клетках, а вальерным спосабам. Летась рэалізавалі тону мяса, сёлета пагалоўе будзе нарошчвацца.

Акрамя таго, у «Райскай даліне» зацікавіліся аграэкатурызмам, а таксама стварылі на яе базе разам з абласной асацыяцыяй фермераў Цэнтр фермерскіх ініцыятыў Гродзеншчыны, які скіраваны на абмен цікавым вопытам, «круглыя сталы» па пытаннях экалагічнага земляробства, здаровага харчавання і іншых надзённых тэмах, заняткі па камп'ютарнай грамаце. Пры гэтым, дарэчы, скарысталіся фінансаваннем у рамках праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Тым самым даказаўшы, што нярэдка бракуе не грашовых сродкаў, а ідэй, якія вартыя інвестыцый. Калі ж ёсць цікавая ініцыятыва і жаданне атрымаць падтрымку, то гэта цалкам рэальна.

— А як жа грыбны бізнес? — цікаўлюся ў Чысцяковых наступствамі вышэйзгаданага падарунка Міхаіла Таццяне.

Аказваецца, яны ўжо даўно займаюцца вырошчваннем грыбнога міцэлію, аднак задуму наладзіць вытворчасць грыбоў (вёшанак і шыітаке) пакуль не ажыццявілі. І, дарэчы, менавіта гэтая ідэя ўвасобілася ў праект аграпрамысловага парка.

— Спачатку мы падалі заяўку ў ЮНІДА, шукаючы фінансавую падтрымку стварэнню грыбной вытворчасці. Ёй зацікавіліся, аднак у значна больш шырокім выглядзе — аграпрамысловага парка з удзелам і іншых фермераў, якія займаюцца вырошчваннем сельскагаспадарчай прадукцыі, — расказвае Таццяна Чысцякова.

Канкрэтныя задачы па стварэнні аграпрамысловага парка нядаўна абмяркоўваліся на сустрэчы кіраўніцтва Гродзенскага аблвыканкама **з начальнікам аддзела падтрымкі малых і сярэдніх сельскагаспадарчых прадпрыемстваў ЮНІДА, міжнародным каардынатарам гэтага праекта Карлам ШАБЕСТАМ**. А ўпершыню ён прыехаў з Вены на Гродзеншчыну, каб разгледзець шэраг праектаў, у 2007 годзе. Заяўкі разглядаліся на конкурснай аснове і найбольшую колькасць балаў набрала фермерская гаспадарка «Райская даліна». Праўда, старт праекту далі зусім не адразу. Можна было ўжо пра яго і забыць, аднак у 2014 годзе Чысцяковым патэлефанавалі з Міністэрства замежных спраў Беларусі і пацікавіліся, ці застаецца для іх актуальнай ідэя стварэння аграпрамысловага парка. І распачалася падрыхтоўка неабходных дакументаў.

### ПРАЕКТУ — ПАДТРЫМКА ЎЛАДЫ

— Стварэнне аграпрамысловага парка для нашай вобласці вельмі важнае. Мы зацікаўлены ў развіцці фермерства і гатовы аказаць гэтаму праекту ўсебаковую падтрымку, — зазначыў на сустрэчы з прадстаўнікамі ЮНІДА **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ**.

Кіраўнік вобласці даручыў стварыць рабочую групу і падрыхтаваць план мерапрыемстваў (дарожную карту) па рэалізацыі праекта, а таксама накіраваць дэлегацыю ў Польшчу для вывучэння адпаведнага вопыту. У прыватнасці, трэба вызначыцца і ўзгадніць з ЮНІДА найбольш мэтазгодныя кірункі перапрацоўчай вытворчасці ў аграпрамысловым парку. Прычым з улікам не толькі наяўных магутнасцяў на Гродзеншчыне, але і перспектыў экспарту прадукцыі. У фермераў можа з'явіцца магчымасць продажу не проста сыравіны, а, што больш выгадна, прадуктаў яе перапрацоўкі.

— Разлічваем, што аграпрамысловы парк аб'яднае вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, перапрацоўшчыкаў і гандаль, — кажа **генеральны дырэктар Гродзенскай абласной асацыяцыі фермераў Уладзімір УШКЕВІЧ.**

На думку **першага намесніка старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Сяргея ШЭЎЧЫКА,** аграпрамысловы парк можа аказваць паслугі не толькі фермерам, але і асабістым падсобным гаспадаркам, садоўніцкім таварыствам. Мажліва, сваю «нішу» знойдуць там і сельскааператывы, прадпрыемствы па перапрацоўцы садавіны і агародніны.

— Пры гэтым стварэнне аграпрамысловага парка дапаможа нам адаптавацца да агульнаеўрапейскіх стандартаў і выпускаць такую прадукцыю, якая можа быць сертыфікавана ў Еўрасаюзе, — лічыць Сяргей Шэўчык.

Зрэшты, задачы праекта не толькі чыста эканамічныя. У далейшым, калі аграпрамысловы парк будзе створаны, сюды змогуць прыйсці на практыку студэнты Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. А можа, і працаўладкавацца.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik!@zviazda.by*

*UNIDO (ЮНІДА) — спецыялізаваная ўстанова ў сістэме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая створана ў 1966 годзе са штаб-кватэрай у Вене (Аўстрыя) дзеля падтрымкі краін, што развіваюцца. Асноўная мэта арганізацыі — садзейнічанне прамысловаму развіццю шляхам аказання тэхнічнай дапамогі ў ажыццяўленні канкрэтных праектаў, распрацоўкі рэгіянальных доўгатэрміновых стратэгій развіцця гэтых краін, правядзення адпаведных даследаванняў. Прыярытэты ЮНІДА — дасягненне грамадскага дабрабыту, развіццё эканамічнай канкурэнтаздольнасці, ахова навакольнага асяроддзя. У арганізацыю ўваходзяць 170 дзяржаў, Рэспубліка Беларусь удзельнічае ў ёй з 1985 года.*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## АХОВА ЗДАРОЎЯ І МЕДЫЦЫНСКАЯ ПРАДУКЦЫЯ З ІНДЫІ

**22-25 сакавіка ў Мінску праходзіць выстава навейшых дасягненняў у галіне медыцыны «Ахова здароўя Беларусі 2016».**

Беларускі медыцынскі форум уключае ў сябе міжнародныя спецыялізаваныя выставы «Ахова здароўя Беларусі», «ФармЭкспа» і «Стаматалогія Беларусі», у якіх традыцыйна бяруць удзел лідары медыцынскай і фармацэўтычнай прамысловасці, распрацоўшчыкі новых тэхналогій дыягностыкі і лячэння захворванняў. Сёлета сваю прадукцыю дэманструюць больш за 200 экспанентаў з 14 краін — гэта сусветныя лідары ў вытворчасці медтэхнікі, расходных матэрыялаў, стаматалагічнага абсталявання, фармацэўтычнай прадукцыі. А Ганаровым госцем стала Рэспубліка Індыя — аб'яднаная экспазіцыя больш як 30-ці індыйскіх кампаній прадстаўляе самы шырокі спектр прадукцыі і вырабаў.

У адкрыцці форуму ўдзельнічаў і міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Васіль Жарко, які, у прыватнасці, расказаў журналістам, што на лячэнне ў нашу краіну летась прыязджалі грамадзяне са 120 краін свету. Найбольшая колькасць — з постсавецкіх краін, а таксама Еўропы, ЗША і Ізраіля. Самымі запатрабаванымі ў замежнікаў аказаліся медпаслугі па кардыялогіі, афтальмалогіі, траўматалогіі, трансплантaлогіі, анкагематалогіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## ТЫДЗЕНЬ ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ

**У Наваполацку падчас вясновых канікулаў праходзіць Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі.**

— З 21 па 27 сакавіка ў бібліятэках арганізоўваецца шмат мерапрыемстваў. Сярод іх — свята «У вас канікулы? Ура! У бібліятэку, дзятва!»; конкурс малюнкаў «Любімыя героі любімых кніг»; шоу-гульня «Вас у казку добрую клічам» і іншыя. Цікавым і карысным абяцае быць і майстар-клас для юных літаратараў, — паведамілі «Звяздзе» ў Наваполацкім гарвыканкаме.

Міжнароднаму Дню птушак прысвяцілі свае мерапрыемства супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя А. Пушкіна. Тут пройдзе літаратурна-экалагічная гадзіна «Хай спяваюць птушкі!». У бібліятэцы імя К. Сіманава правядуць майстар-клас па вырабе велікодных сувеніраў з падручнага матэрыялу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

## З ПЕРШЫМ БЯРОЗАВІКАМ!



**Лясгасы краіны нарыхтавалі першую тысячу тон бярозавіку ў сёлетнім сезоне.**

Згодна з аператыўнымі звесткамі Міністэрства лясной гаспадаркі, у лідарах цяпер Брэсцкая вобласць, дзе нарыхтавана 1 444 тоны соку. У Гомельскай вобласці «запісалі ў актыў» 151 тону, у Гродзенскай — 143 тоны, у Мінскай вобласці — 29 тон. Праўда, пакуль у сувязі з умовамі надвор'я рух сокаў часова прыпыніўся.

Сёлета на Віцебшчыне бярозавы сок насельніцтву лясгасы будуць прадаваць па 3 тысячы рублёў за літр. А на лесасеках — на 600 рублёў менш.

— У Віцебску сок можна будзе купіць ля будынка лясгаса: на вуліцы Міра, 44. Туды штогод дастаўляюць сок у вялікай бочцы аб'ёмам некалькі тон. І проста на месцы можна заплаціць. Калі пажадаеце набыць сок на лесасецы, патрэбна квітанцыя, якая пацвердзіць аплату, — распавёў карэспандэнту «Звязды» Васіль Кірпічонак, намеснік начальніка аддзела дзяржкантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, расліннага і жывёльнага свету, нетраў, асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і абыходжаннем з адходамі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. — Леснікі зрабілі пробную падсочку: падвесілі на дрэвы поліэтыленавыя мяшкі. Але сок пакуль не ідзе, бо яшчэ холадна.

Нарыхтоўка сокаў дрэў забараняецца ў населеных пунктах, дэндралагічных садах (парках), батанічных садах, курортных лясах і лесапаркавых частках зялёных зон, у месцах масавага адпачынку насельніцтва, у прыбярэжных палосах водных аб'ектаў.

Адказнасць за парушэнні адпаведных правілаў і тэхналогіі падсочкі сур'ёзная. Для грамадзян прадугледжаны штраф да 20 базавых велічынь, а для юрыдычных асоб — да 500 базавых велічынь.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*
**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ На сувязі

# РОЎМІНГ АД МТС — ПА НОВЫХ ТАРЫФАХ

**Пра значнае зніжэнне з 1 красавіка кошту роўмінгу на тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза паведаміла кампанія МТС. Змяненні закрануць усе віды сувязі: уваходныя званкі, зыходныя выклікі ў Беларусь і ў іншыя дзяржавы, SMS-паведамленні, а таксама мабільны інтэрнэт. Па некаторых кірунках паслугі мабільнай сувязі патаннеюць на 84%.**

Напрыклад, зыходныя званкі з Расіі, Арменіі і Кыргызстана ў Беларусь для абанентаў МТС, якія знаходзяцца ў сетках аператараў МТС Расія, АрменТэл і Sky Mobile, патаннеюць на 20%. На столькі ж знізіцца кошт зыходных званкоў у іншыя краіны з Казахстана, Арменіі і Кыргызстана ў выпадку рэгістрацыі ў сетках Кар-Тэл, АрменТэл і Sky Mobile. Для абанентаў МТС цана на зыходныя SMS з казахскай сеткі Кар-Тэл і кіргізскай Sky Mobile будзе таксама зніжана на 20%. А за мабільны інтэрнэт кліенты беларускага аператара, якія знаходзяцца ў сетках Sky Mobile (Кыргызстан) і АрменТэл (Арменія), будуць плаціць менш на 84% і 78% адпаведна.

У кампаніі МТС канстатуюць, што краіны ЕАЭС — самыя запатрабаваныя напрамкі сярод абанентаў МТС. На гэтыя чатыры дзяржавы ў роўмінгу прыпадае амаль 70% зыходных выклікаў, а таксама каля 50% усіх уваходных выклікаў і інтэрнэт-трафіка.

Таксама аператар МТС праінфармаваў аб увядзенні штохвіліннай тарыфікацыі галасавога трафіка з 1 красавіка 2016 года.

Пачынаючы з гэтай даты, на ўсіх тарыфных планах кампаніі галасавы трафік па Беларусі будзе тарыфікавацца штохвілінна: як выклікі ўнутры сеткі МТС (у тым ліку на «любімыя нумары» і ўнутры закрытай групы карыстальнікаў), так і званкі ў іншыя сеткі краіны. Змяненні таксама закрануць паслугі, якія прадугледжваюць пасекундную тарыфікацыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Извещение о проведении 08 апреля 2016 года повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, местонахождение, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Балансодержатель (должник) | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | Цех столярный для распиловки, дата ввода 01.08.2004, инвентарный номер 10000008, общей площадью 335,6 кв. м, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 16а | ОАО «МонолитГрад» | 1 910 295 100 | 191 000 000 |

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 08 апреля 2016 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 23.03.2016 по 06.04.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-48-36, 327-40-22 (государственное предприятие «МГЦН»).**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-12047 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 124,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422086505101001109 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания), площадью 0,0324, расположен по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2 |
| **Начальная цена продажи** | 409 510 000 (четыреста девять миллионов пятьсот десять тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 40 951 000 (сорок миллионов девятьсот пятьдесят одна тысяча) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 11 апреля 2016 г. в 16.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 5 апреля 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

---

**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске**
**ИНФОРМИРУЕТ О ПРИЗНАНИИ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМИ:**

- страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВА № 3965717-3965721.

УНП 100706519

---

# ОАО «ИЗМЕРИТЕЛЬ»

Учетный номер плательщика: 300044189
Вид экономической деятельности:
Производство электрораспределительной и регулирующей аппараты
Организационно-правовая форма: ОАО
Орган управления:
ОАО «Управляющая компания холдинга «Горизонт»
Единица измерения: млн руб.
Адрес: г. Новополоцк, ул. Молодежная, 166

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 г.

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 104 606 | 104 485 |
| Нематериальные активы | 120 | 911 | 101 |
| **Доходные вложения в материальные активы** | **130** | **1 811** | **1 761** |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 1 811 | 1 761 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 157 | 1 254 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 | 1 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | 1 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| в том числе аккредитивы | 171 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **107 486** | **107 603** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **Запасы** | **210** | **17 232** | **18 220** |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 7 337 | 8 639 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 7 153 | 4 892 |
| готовая продукция и товары | 214 | 2 742 | 4 689 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 723 | 350 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 131 | 431 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 10 231 | 13 844 |
| в том числе аккредитивы | 251 | - | - |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 421 | 1 291 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 71 | 71 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **30 809** | **34 207** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **138 295** | **141 810** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 36 418 | 36 418 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 288 | 288 |
| Добавочный капитал | 450 | 77 252 | 79 088 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 10 435 | 11 793 |
| Чистая прибыль(убыток) отчетного года | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **124 393** | **127 587** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | 295 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **295** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 2 080 | 3 885 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| **Краткосрочная кредиторская задолженность** | **630** | **9 844** | **8 177** |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 4 449 | 4 130 |
| по авансам полученным | 632 | 2 673 | 1 090 |
| по налогам и сборам | 633 | 750 | 557 |
Як зразумець, што пазногці на руках ці нагах атакавалі грыбкі? Па знешнім выглядзе: пазногаць патаўшчаецца, цьмянее, жаўцее, становіцца ломкім і крохкім. Калі інфекцыя напаткала пазногці ступняў, то гэта стане не проста касметычнай праблемай — цяжка будзе падабраць абутак, падчас хады ўзнікне боль, дыскамфорт. Лячэннем захворвання (яно называецца аніхамікозам) займаюцца ўрачы-дэрматолагі і міколагі. Папярэдні дыягназ ставіцца на падставе агляду і дыягностыкі — мікраскапічнага даследавання саскрэбу з пазногця, у некаторых выпадках патрабуецца бактэрыялагічны пасеў на спажыўнае асяроддзе.

— Інфекцыя развіваецца вельмі хутка і заражае іншыя пазногці, — кажа **ўрач-дэрматавенеролаг Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Людміла УВАРАВА.** — Чым раней пачаць лячэнне, тым лепшым будзе эфект, менш працяглым сам працэс. Для лячэння прымяняюцца як растворы, мазі, крэмы, лакі з супрацьгрыбковымі лекамі (іх наносяць на пазногцевую пласціну), так і супрацьгрыбковыя таблеткі, капсулы ўнутр. Толькі мазі-крэмы прымяняюць на самым пачатку пашкоджання, або калі пацыент не можа прымаць прэпарат унутр. Арсенал такіх сродкаў у аптэцы багаты, і калі вы набудзеце іх самастойна, нічога страшнага не здарыцца. Аднак пайсці да ўрача ўсё ж такі трэба. Таму што адны толькі крэмы могуць не дапамагчы — яны не здольны пранікаць глыбока ў тканку пазногця. Самае лепшае — уздзейнічаць і звонку, і знутры...

Таблеткі і капсулы — прэпараты сур'ёзныя, маюць пабочныя эфекты, таму прызначыць іх павінен урач. Звычайна лячэнне пазногцяў рук працягваецца 2 месяцы, ступняў — 3 месяцы.

Адмерлыя ўчасткі пазногця неабходна выдаляць. Праводзіцца гэта з дапамогай спецыяльных размякчальных мазяў і пластыраў. Другі варыянт — апаратная чыстка, паслойнае зняцце пазногцевай пласціны. Працэдура не балючая, не патрабуе падрыхтоўкі і асаблівага догляду пасля правядзення. Апаратная чыстка ў шмат разоў павышае эфектыўнасць лячэння — у стончаную пласціну лепш пранікаюць лекі.

Пры пашкоджанні пазногцяў ступняў вельмі важным будзе і дасканалая супрацьгрыбковая апрацоўка абутку. Надалей коратка падстрыгайце пазногці, насуха выцірайце ногі пасля купання, выкарыстоўвайце супрацьгрыбковыя лакі ■



■ Асаблівасці захворвання

# ЯК ТЛУШЧ ЗАБІВАЕ ПЕЧАНЬ

## Лішняя вага або спроба вельмі хутка ад яе пазбавіцца могуць загубіць гэты орган

**ДОБРА вядома, што ў таго, хто злоўжывае алкаголем, печань не можа быць у парадку. Аднак нават калі вы не ўжываеце спіртныя напоі наогул, гэта яшчэ не гарантыя таго, што печань будзе здаровай. Што ж яшчэ можа нашкодзіць гэтаму органу і таксама прывесці да цырозу? Лішнія кілаграмы! Чым далей наша вага ад нормы, тым прасцей печані выйсці са строю. Пра асаблівасці гэтай праблемы расказвае <u>дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, урач-гастраэнтэролаг вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ</u>.**

### ХАРЧАВАННЕ З АБМЕЖАВАННЕМ

*Для зніжэння вагі неабходна не толькі павялічыць фізічную актыўнасць (штодня выконвайце любыя практыкаванні цягам гадзіны, хадзіце пешшу па 4-6 км), але і знізіць каларыйнасць харчавання.*

*Пры любой паталогіі печані рэкамендуецца спецыяльны дыетычны стол.*

***1.** Усе стравы гатуюцца на пары або варацца.*

***2.** Рэкамендуюцца: хлеб учарашняй выпечкі; любыя крупы; супы з гародніны, крупяныя, малочныя, боршч, капуста; нятлустае мяса, птушка, рыба; малочныя прадукты невысокай тлустасці; агародніна, садавіна, ягады.*

***3.** Не ўжываць: свежы хлеб, здобу, крэмавыя вырабы; наварыстыя мясныя, рыбныя і грыбныя булёны, халаднік, салёную капусту; тлустае мяса, сала, маргарын; вяршкі і малако 6-працэнтнай тлустасці; бабовыя, шчаўе, радыску, зялёную цыбулю, часнок, марынады; вэнджанае і кансервы; шакалад, чорную каву, какаву; алкаголь.*

***4.** Абмежаваць: масла і алей.*

— У сусветнай практыцы ўрачы-тэрапеўты і ўрачы агульнай практыкі выяўляюць падчас сваіх прыёмаў немалую колькасць пацыентаў з неалкагольнай тлушчавай хваробай печані. Такое захворванне сустракаецца ў 300 пацыентаў з 1000! У групе рызыкі — людзі з лішняй вагой. Сучасны чалавек абавязкова павінен ведаць свой індэкс масы цела. Разлічваецца ён па формуле: вагу (кг) дзелім на рост (м) у квадраце.

Індэкс у межах 18,5-25 — гэта норма, 25-30 — гэта ўжо лішняя вага, 30-35 — атлусценне 1 ступені, 35-40 — 2-й ступені, звыш 40 — 3-й ступені. Існуе і больш просты спосаб вызначэння лішніх кілаграмаў — дастаткова памераць аб'ём таліі. У мужчын гэты паказчык не павінен перавышаць 94 см, у жанчын — 80 см. Чым больш лішняй вагі, чым большая ступень атлусцення, тым хутчэй развіваецца паталогія і хутчэй праходзіць усе стадыі.

Сёння неалкагольная тлушчавая хвароба становіцца пандэміяй. Амерыканскія даследчыкі сцвярджаюць, што колькасць людзей з лішняй вагой прырастае на планеце на 2-2,5 працэнта за год. Адпаведна, такімі ж тэмпамі расце колькасць хворых з пашкоджаннем печані.

***— Значыць, можна не сумнявацца, што ў цябе ёсць неалкагольная тлушчавая хвароба печані, калі вага перавышае норму?***

— Менавіта так. Іншая рэч, гэта захворванне мае некалькі стадый. Напачатку гэта будзе тлушчавы стэатоз, калі пячоначная клетка перанасычаецца тлушчам. Калі мы не прымаем ніякіх захадаў, развіваецца неалкагольны стэатагепатыт, калі ў выніку перанасычэння тлушчам ужо ўзнік запаленчы працэс, пры якім частка клетак пачала гінуць. Наступны цяжкі этап — разрастанне злучальнай тканкі ў печані, дэфармацыя ўнутрыпячоначных пратокаў і сасудаў, што на чацвёртай стадыі захворвання пераходзіць ужо ў цыроз, поўнае парушэнне работы органа.

***— І ва ўсім вінаваты тлушч, які назапасіўся на баках?***

— Так, галоўная прычына развіцця неалкагольнай тлушчавай хваробы — менавіта атлусценне. Аднак у шэрагу выпадкаў трэба мець на ўвазе наяўнасць цукровага дыябету 2 тыпу або парушэнне абмену халестэрыну з павышэннем канцэнтрацыі ліпідаў нізкай шчыльнасці — «шкоднага» халестэрыну. Ліпіды высокай шчыльнасці, наадварот, абараняюць пячоначныя клеткі.

***— Якім чынам тлушч перашкаджае печані?***

— Лішняя вага, высокі «шкодны» халестэрын і цукровы дыябет 2 тыпу спрыяюць таму, што ў крыві павышаецца колькасць свабодных тлустых кіслот і трыгліцэрыдаў, а пячоначная тканка вельмі адчувальная да іх, яна іх прыцягвае, каб «утылізаваць», пазбавіць арганізм лішку ліпідаў. Наша печань — унікальны орган, выконвае ў арганізме столькі задач, колькі не выконваюць ні сэрца, ні лёгкія, і мы зараз гаворым толькі пра адну з яе функцый.

Аднак не толькі тлушч ва ўсім вінаваты. Захворванне могуць абумовіць і лекі з гепататаксічным эфектам, напрыклад, глюкакортыкастэроіды (прэднізалон, гідракартызон), нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты (ібуфен, ібупрафен, аспірын), некаторыя антыбіётыкі (тэтрацыкліны). Аднак тут важным будзе не ўжыванне гэтых лекаў у прынцыпе, бо калі б кожная таблетка была настолькі таксічнай, іх бы проста не выпускалі... Трэба мець на ўвазе індывідуальную адчувальнасць пячоначнай тканкі да пералічаных прэпаратаў. Некаторым людзям дастаткова некалькі разоў ужыць тэтрацыклін, як у іх ужо выяўляецца першая стадыя пашкоджання печані — стэатоз, а калі праблема не была выяўлена адразу, то будуць развівацца і наступныя стадыі.

Яшчэ адзін важны момант — хуткае зніжэнне вагі. Гэта катастрофа для печані. Дастаткова двух тыдняў галадання, як орган будзе пашкоджаны. Маса цела павінна зніжацца не больш як на 1 кг цягам тыдня, або на 4 кг за месяц.

Мне давялося кансультаваць не так даўно пацыентку з дыягназам анарэксія. Дзяўчына імкліва страчвала вагу і ўрэшце важыла ўсяго 24 кг. На момант агляду ў яе былі жоўтыя склеры, жоўтая скура, павялічаная печань, паказчыкі ўсіх пячоначных ферментаў павышаныя ў некалькі разоў. Гэта ўжо стэатагепатыт. Пры зніжэнні вагі тлушч ператвараецца ў свабодныя тлустыя кіслоты, іх становіцца шмат, печань не спраўляецца іх утылізаваць і вялікая іх колькасць застаецца ў яе тканцы.

***— Што прапануецца ў якасці лячэння на розных стадыях захворвання?***

— Гепатоз, першая стадыя хваробы, — гэта яшчэ зваротная сітуацыя. Пры хуткім прыняцці мер печань можна ўратаваць. Стэатагепатыт — сітуацыя больш складаная. Мы можам зняць запаленне, але аднавіць клеткі, якія загінулі — на жаль, не... Іншая рэч, печань будзе намагацца кампенсаваць сваю работу той колькасцю клетак, што засталіся.

### НАШЫ ДАСЛЕДАВАННІ

*Пры абследаванні 280 хворых з неалкагольнай тлушчавай хваробай печані ў 62 працэнтаў было выяўлена атлусценне, у 20 працэнтаў — цукровы дыябет 2 тыпу, у 13 працэнтаў — выражанае парушэнне халестэрынавага абмену, 2 працэнты ўжывалі гепататаксічныя прэпараты...*

Важна прыняць меры на стадыі гепатозу. І галоўнай мерай будзе здаровы лад жыцця. Трэба не толькі знізіць вагу, але не набіраць яе зноў, не злоўжываць алкаголем і г.д. Хворым на цукровы дыябет неабходна дабівацца стабільнага паказчыку глюкозы. Лекавая тэрапія калі і будзе прызначана, то ў якасці дапаможнага захаду. Змена ладу жыцця паспрыяе вылечванню на першай стадыі хваробы, а на другой стане істотнай кампенсацыяй.

Звычайна лекі патрабуюцца на стадыі стэатагепатыту. Трэба сказаць, што самастойна, без абследавання і агляду ўрача, нельга прымаць прэпараты, якія прымяняюцца ў гепаталогіі. У кожнага прэпарата — свой механізм дзеяння. Напрыклад, эсэнцыяльныя фосфаліпіды, якія паляпшаюць працэс аднаўлення клетак печані, прызначаюцца на другой стадыі захворвання, а ў іншым выпадку такое ўжыванне немэтазгоднае.

Пры невялікім павелічэнні паказчыкаў АСТ і АЛТ могуць выкарыстоўвацца і раслінныя прэпараты на аснове растаропшы. А на аснове гарбуза ў Расіі нават пачалі выраб прэпарата «тыкввеол», які таксама паказаны для лячэння стэатозу і стэатагепатыту. Рэкамендуецца пры парушэнні работы печані і ўжыванне страў з гарбуза.

***— Якія скаргі могуць з'явіцца ў хворага?***

— Сама печань ніколі не баліць — там проста няма болевых канчаткаў. Аднак хворы можа адчуваць цяжар у правым падрабрынні. Таму што капсула печані ў выніку змен пачынае расцягвацца і ціснуць на іншыя тканкі і органы. Зніжаецца працаздольнасць, парушаецца сон — гэта класічныя сімптомы. Аднак у большасці хворых пры гепатозе няма ніякіх сімптомаў.

Праблему дапаможа выявіць біяхімічны аналіз крыві — перавышэнне ў 2-4 разы ўзроўню такіх ферментаў, як АСТ і АЛТ, прычым узровень АЛТ заўсёды большы, чым АСТ. Значна радзей павышаецца білірубін (звыш 20,5 мкмоль/л). У некаторых з'яўляецца затрымка жоўці, аб чым будзе сведчыць павышэнне шчолачнай фасфатазы.

Наогул дыягностыка павінна ўключаць фізічнае і лабараторнае абследаванне, ультрагукавое даследаванне, падчас якога выяўляюць павелічэнне эхагеннасці печані. Для ўдакладнення могуць прызначацца і камп'ютарная або магнітна-рэзанансная тамаграфія, радыеізатопнае сканаванне, вельмі рэдка — біяпсія ■

■ Толькі пра дзяўчатак

# І НІЯКІХ СТРЫНГАЎ

**Калі мамы не перададуць сваім дочкам навыкі штодзённай гігіены, лічы, прапала іх жаночае здароўе.**

Інтымная гігіена дзяўчатак ва ўзросце ад нараджэння да 5 гадоў — вельмі важная частка догляду, які мама павінна правільна арганізаваць, нагадвае **інструктар-валеолаг Кацярына БЛІЗНЮК.**

— Чысціня стане прафілактыкай многіх захворванняў. Тут спатрэбяцца і вільготныя ватныя дыскі, вільготныя сурвэткі, пажадана гатаваная вада, ручнік і мачалка (выключна індывідуальныя).

— Пасля мыцця скуру неабходна прамакнуць мяккім ручніком, але не выціраць, каб не справакаваць пачырваненне і раздражненне.

— Пасля кожнай замены аднаразовых «памперсаў» рабіце паветраныя ванны — хай скура «падыхае» 5-7 хвілін. Не набывайце вельмі танныя падгузкі невядомых вытворцаў.

— Бялізна для дзіцяці — толькі з натуральных тканін: аддавайце перавагу бавоўне і льну. Ніжняе і верхняе адзенне не павінна абмяжоўваць рух і перацiскаць палавыя органы. Калі дзяўчынка падрасце, патлумачце, што карыстанне стрынгамі здольнае выклікаць раздражненне і запаленне.

— Ніколі не мыйце разам бялізну дзіцячую і дарослую. Выкарыстоўвайце пры гэтым спецыяльныя сродкі, не здольныя выклікаць алергічных рэакцый.

— Пры любых зменах у здароўі паказвайце дзяўчынку ўрачу. Звычайна пры раздражненні скуры ратаваць могуць адвары супрацьзапаленчых траў. Аднак праблемы бываюць і больш сур'ёзныя. Выявіць прычыну непрыемнасцяў дапаможа дзіцячы гінеколаг ■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

алімпіец
ЗВЯЗДА
выпуск № 3 (40)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

■ Святочнае

# З Днём нараджэння, НАК!

## НАЦЫЯНАЛЬНАМУ АЛІМПІЙСКАМУ КАМІТЭТУ КРАІНЫ СПОЎНІЛАСЯ 25 ГАДОЎ

**З моманту свайго ўтварэння НАК Беларусі стаў па-сапраўднаму вялікай і аўтарытэтнай грамадскай арганізацыяй, якая ўнесла значны ўклад у развіццё спорту, папулярызацыю фізічнай культуры і пашырэнне здаровага ладу жыцця. Праз год пасля свайго з'яўлення (у 1992) НАК Беларусі быў прызнаны Міжнародным алімпійскім камітэтам у якасці часовага члена гэтай арганізацыі. А ўжо ў 1993-м, на 101-й сесіі МАК у Манака, стаў паўнапраўным удзельнікам сусветнай алімпійскай сям'і, тым самым Беларусь атрымала права дэлегаваць на Алімпійскія гульні сваю нацыянальную каманду.**

За гэты час нашы спартсмены выступілі на адзінаццаці Алімпійскіх гульнях — шасці зімніх і пяці летніх. На галоўных спартыўных спаборніцтвах планеты яны заваявалі 91 медаль: 18 залатых, 28 сярэбраных і 45 бронзавых. Усяго ж на рахунку айчынных спартсменаў, якія ўнеслі сваю лепту ў алімпійскі рух сусветнага спорту ў складзе зборных Савецкага Саюза, Аб'яднанай каманды СНД і нацыянальнай дружыны, — 222 узнагароды.

**З 25-годдзем Нацыянальны алімпійскі камітэт павіншаваў кіраўнік дзяржавы, прэзідэнт НАК Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

«Мы па праву ганарымся бліскучымі выступленнямі беларускіх атлетаў, якія ўпісалі яркія старонкі ў пераможны летапіс айчыннага спорту. Іх дасягненні служаць умацаванню аўтарытэту нашай краіны, фарміруюць яе станоўчы імідж на міжнароднай арэне», — гаворыцца ў віншаванні.

Сёння перад Нацыянальным алімпійскім камітэтам стаяць адказныя задачы, ад вырашэння якіх у многім залежыць канкурэнтаздольнасць беларускага спорту, падкрэсліваецца ў віншаванні.

«Сёлета ў Рыа-дэ-Жанейра адбудуцца летнія Алімпійскія гульні, і беларускі народ разлічвае на паспяховае выступленне нашых атлетаў на галоўных стартах чатырохгоддзя. Таму сёння ўсім неабходна прыкласці максімум намаганняў для забеспячэння падрыхтоўкі камандаў на самым высокім узроўні», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка ■

■ Яны рыхтуюць чэмпіёнаў

# НАПЕРАДЗЕ НАС ЧАКАЮЦЬ ПОСПЕХІ

## Дзмітрый Дашчынскі — трэнер для спартсменаў і тата для сваіх сыноў

**Пра тое, як адбыўся пераход праслаўленага фрыстайліста з акрабата ў настаўнікі, што чакае наш фрыстайл у будучыні і якую ацэнку даць сезону, які падышоў да завяршэння.**


Цяпер — калегі: Мікалай КАЗЕКА і Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ.

Спаборніцкі год для лятаючых лыжнікаў краіны скончыўся, а значыць, самы час падводзіць вынікі. Гаварыць ёсць пра што, бо ў гэтым сезоне Беларусь прымала шэраг міжнародных спаборніцтваў, а спартсмены заваёўвалі прэстыжныя ўзнагароды. Гэта мае асаблівую каштоўнасць для зборнай цяпер, калі вялікі спорт пакінулі алімпійскія чэмпіёны, а на змену ім прыйшла моладзь. Прыйшла і не згубілася ў сусветнай эліце: беларусы па-ранейшаму сярод лідараў у фрыстайле. Адзначым, што змены адбыліся не толькі ў складзе спартсменаў, але і сярод трэнераў. Першы паўнавартасны сезон з юніёрскай камандай адпрацаваў вядомы ў недалёкім мінулым фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі. Сёння ён расказвае пра сваю новую працу, пра тое, як выстройвае адносіны ў камандзе, падводзіць вынікі сезона і дзеліцца планамі.

***— Дзмітрый, сёлета Беларусь прыняла шэраг міжнародных спаборніцтваў па фрыстайле. Як ацэніце іх арганізацыю?***

— Аб'ектыўна магу меркаваць пра гэта па водгуках удзельнікаў і гасцей з іншых краін: усё атрымалася добра. Калі казаць пра летні турнір у новым цэнтры «Фрыстайл», то там праблем не ўзнікла наогул. Цэнтр унікальны, таму з задавальненнем там заўсёды спартсмены і трэніруюцца, і выступаюць. Быў толькі адзін недахоп — невялікая колькасць удзельнікаў, спадзяваліся зрабіць турнір больш прадстаўнічым. Сёлета, у верасні, будзем выпраўляць сітуацыю, плануецца правесці сумесны турнір са Швейцарыяй: на адных выхадных спартсмены выступяць у Еўропе, а ўжо на наступных — у Беларусі. Гэта нашмат зручней, ды і так з'явіцца магчымасць прыцягнуць большую колькасць фрыстайлістаў, зрабіць турнір больш прадстаўнічым. Магчыма, прыедуць амерыканцы, канадцы, аўстралійцы.

***— З зімнімі турнірамі справы ішлі куды больш праблематычна.***

— Летась у нас ужо быў вопыт правядзення міжнародных спаборніцтваў у цяжкіх умовах надвор'я, таму сёлета было лягчэй. Усё атрымалася нармальна, ніякіх наракканняў не было, у наступным годзе, наколькі я ведаю, таксама плануем прымаць этап Кубка свету. Мы спрабуем удасканальвацца: гэтай зімой выкарыстоўвалі сухі лёд, плануецца купіць яшчэ металічны трамплін (ён больш просты ў выкарыстанні і падрыхтоўцы, але больш надзейны). Плюс зрабіць стацыянарную сістэму намарожвання, таму што сухі лёд — гэта ўсё ж часовае рашэнне, і нятаннае.

***— Як ацэніце працу спартсменаў у сёлетнім сезоне?***

— Нацыянальная каманда выступіла на добрым узроўні. Была перамога на Кубку свету ў Кітаі, шмат прызавых месцаў на іншых этапах, а галоўнае, я лічу, што на хатніх спаборніцтвах паказалі добрую форму — адразу два прызавыя месцы, даўно такога не было. Трэба памятаць, што практычна цалкам змяніўся склад каманды, таму гэта добры вынік.

***— Вы працуеце з рэзервам, таму, напэўна, ведаеце, чаго чакаць заўзятарам у будучыні...***

— Юніёры таксама прайшлі гэты год цалкам удала. У найбліжэйшым рэзерве ёсць пара чалавек, якія годна могуць прадстаўляць краіну ў далейшым. Тым больш выкарыстанне нашага новага воднага трампліна спрашчае падрыхтоўку і спартсменам, і трэнерам. Калі раней юніёры летам маглі выехаць на збор максімум 2 разы, то цяпер скакаць можна круглы год. Дзякуючы гэтаму мы зможам хутка дабавіць, палепшыць якасць скачкоў.

Раней у нас быў разрыў паміж асноўнай камандай і юніёрамі, дзесьці не хапала дапамогі з боку моладзі, а цяпер яны ўжо пачынаюць расці. Гэта адбываецца ў тым ліку дзякуючы падтрымцы з боку нацыянальнай каманды і асабіста Мікалая Іванавіча Казекі. Ён больш увагі стаў надаваць юніёрам, самых лепшых з іх прыцягвае на сумесныя зборы, разам скачуць, трэніруюцца, выступаюць — гэта дае вынік. Я, са свайго боку, працую са спартсменамі над базай, над якасцю скачкоў, якой недзе, напэўна, не хапала ім раней. Сёлета ўжо быў добры вынік: на юніёрскім чэмпіянаце свету другое месца Дзімы Мазуркевіча, на ўсіх этапах Кубка Еўропы ў нас былі прызавыя месцы, плюс наша каманда выйграла Кубак нацый. Адзначу, што на п'едэстале ў гэтым сезоне пабывалі ўсе члены юніёрскай зборнай: гэта сведчыць пра тое, што яны гатовыя змагацца і паказваць добры вынік. Думаю, і наперадзе нас чакаюць поспехі.

***— Гэта ваш першы паўнавартасны год у ролі трэнера?***

— Пачаў працаваць з камандай яшчэ ў мінулым сезоне, але афіцыйна трэнерам не быў, праца праходзіла больш спантанна, а сёлета больш грунтоўна ўзяліся, таму яго можнаназваць больш паўнавартасным.

***— Як ацэніце сваю працу?***

— Асноўны паказчык — гэта вынікі маіх спартсменаў і тое, якая атмасфера, настрой у калектыве. На мой погляд, у нас усё добра, пакуль усё больш-менш атрымліваецца, ды і калектыў цудоўны.

***— Вернемся да моманту, калі вам прапанавалі перайсці на трэнерскую працу. Былі сумненні або страхі на гэты конт?***

— Каб баяцца, спачатку трэба паспрабаваць, таму нічога падобнага не адчуваў. Было цікава прымяніць свой вопыт, паспрабаваць нешта новае. Адна справа, калі ты спартсмен, заняты сам сабою і толькі сваімі вынікамі, а тут трэба кіраваць калектывам, думаць за ўсіх. Працы, вядома, значна больш, і яна зусім іншая. Было цікава, як я ўпішуся ў гэтую ролю, ці змагу перадаць свае веды спартсменам. Над прапановай асабліва не задумваўся, таму што ў нас ужо гадамі напрацаваны добры калектыў: можна сказаць, што я нікуды не сыходзіў, проста мая роля памянялася. У камандзе такога ўзроўню, як зборная Беларусі, працаваць для мяне за гонар, таму гэтую прапанову прыняў, не раздумваючы.

***— Як адрэагавала сям'я на тое, што вы ўсё ж засталіся ў спорце?***

— Нармальна. Цяпер дома бываю часцей, хоць зборы, паездкі ўсё роўна засталіся. Узімку, калі трэніруемся ў Раўбічах, можна спакойна ездзіць дадому, летам шмат часу праводзім у Мінску. Вядома, цяпер больш часу для сям'і: і ім добра, і мне. Хоць родным мяне заўсёды не хапае, колькі б я ні быў дома.

***— Калі самі скакалі апошні раз?***

— На апрабаванні воднага трампліна ў цэнтры «Фрыстайл».

***— Не сумуеце?***

— Першы час бывала, што хацелася самому паскакаць. Спартсменам словамі тлумачыш, тлумачыш, а здаецца, стаў бы сам на лыжы, скокнуў і паказаў. Гэта нашмат прасцей, чым на словах расказаць. З часам такое жаданне прайшло, ды і я разумею, што скачкі для мяне ўжо — рэч з пэўнай доляй рызыкі. Нейкія старыя траўмы могуць вылезці. Мінулым летам я, проста скачучы ў басейн, зноў вывіхнуў плячо. Калі ўвесь час фізічную форму не падтрымліваеш, то скакаць небяспечна, тым больш цяпер у мяне ёсць адказнасць перад камандай і перад сям'ёй.

***— Для вас складаней скакаць самому ці назіраць за выступленнем свайго вучня?***

— Гэта зусім розныя адчуванні. Калі вы маеце на ўвазе хваляванне, то ў мяне яго няма. Я сам выступаў на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню, і ў апошні час маёй кар'еры ўзнікала такая праблема, што не хапала нейкага адрэналіну. Этапы Кубкаў свету сталі проста як трэніроўкі, стандартная праца, а не адметная падзея. Цяпер, калі мае вучні выступаюць на этапах Кубка Еўропы, для мяне гэта паняцце наогул не сур'ёзнае, але я разумею, што для юніёраў цяпер гэта максімум, гэта іх асноўныя спаборніцтвы. Яны адчуваюць велізарнае хваляванне, прыкладна як я на Алімпіядзе, таму даводзіцца неяк настройваць сябе. Ды і моцнае хваляванне з майго боку тут таксама не патрэбна. Калі ты трэнер, усё па-іншаму, узнікае шмат нюансаў (трэба прадумаць хуткасць, куды лепш стаць спартсмену, потым у паветры яму падказаць), а калі ты спартсмен, то думаеш толькі пра свой скачок.

***— На ваш погляд, якімі якасцямі павінен валодаць добры трэнер?***

— Гэта складанае пытанне, тут павінна быць шмат усяго. Побач са мной ёсць добры прыклад — Мікалай Іванавіч Казека. Чалавек, які перш за ўсё фанатычна ставіцца да сваёй справы. Ён гатовы ў любы момант усё кінуць і заняцца фрыстайлам. Іншых трэнераў заўсёды напружвае гэта, і шмат каму, я бачу, часам цяжка, бывае, што і адпачынкаў няма, і выхадных. А Мікалай Іванавіч заўсёды працуе, ён вылучаецца тым, што надае шмат увагі дробязям, здаецца, нейкім нязначным момантам у скачках, але менавіта дзякуючы гэтаму ў нас такая моцная каманда. Кожная дэталь адпрацавана «ад» і «да», усё зроблена ідэальна. Яшчэ важна, што ў яго ёсць прафесійны нюх: калі трэба прыняць важнае рашэнне, ён можа сумнявацца, мяняць думку, але ў выніку прымае менавіта тое рашэнне, якое аказваецца правільным. Таму, я лічу, у трэнерскай працы галоўнае — любоў да сваёй справы, прысвячэнне ўсяго часу, у тым ліку і свабоднага, спорту.

***— Многія спартсмены прызнаюцца, што трэнер паступова становіцца другім бацькам. Вам ужо даводзілася адчуць гэта на сабе?***

— У нас з маімі вучнямі вельмі добрыя адносіны: яны расказваюць мне нешта з жыцця па-за спортам, як правялі выхадныя, што нарабілі. Я стараюся спакойна да гэтага ставіцца, таму што прытрымліваюся таго пункту гледжання, што людзі самі павінны прымаць рашэнні. Усе мы ў такім узросце рабілі памылкі, я магу даць параду, сказаць, як лепш зрабіць, але не буду караць і настойваць на сваім. Яны павінны разумець, што выбар за імі і яны за яго ў адказе.

***— Што для вас, як для трэнера, з'яўляецца найвышэйшай узнагародай?***

— Трэнер са спартсменам працуюць у адной звязцы, на адзін вынік, таму для мяне асноўная ўзнагарода — гэта перамога на спаборніцтвах майго вучня. Плюс — калі хтосьці з юніёраў зможа трапіць у нацыянальную каманду і там дамагчыся высокіх вынікаў, гэта можна будзе таксама лічыць маім дасягненнем.

***— У будучыні вы хацелі б кіраваць галоўнай камандай краіны?***

— Вядома, такое жаданне ёсць. Ці змагу — гэта іншае пытанне, на яго адкажа час. Калі я быў спартсменам, то пабываў на самых прэстыжных турнірах. Хочацца спаборнічаць на такім жа максімальным узроўні і ў якасці трэнера, таму ў будучыні я спадзяюся, што змагу трэніраваць нацыянальную каманду, выступіць з ёй на Алімпійскіх гульнях — гэта ўсё ж асноўная мэта любога спартсмена і трэнера, які працуе з ім ■

■ На старце чэмпіянату

# Людас РУМБУЦІС: «У нас заўсёды так: два заўзятары — тры думкі»

**Футбольны сезон у краіне ўжо распачаўся, па традыцыі ён стартаваў з розыгрышу Суперкубка. У матчы БАТЭ — «Шахцёр» хапала эмоцый, спрэчных момантаў, прыгожых фінтоў і галоў — наогул усяго, за што мы так любім гульню нумар адзін. Шосты раз уладальнікамі Суперкубка сталі барысаўскія футбалісты, ну а хто паспрачаецца за лідарства ў чэмпіянаце краіны сёлета, мы паспрабавалі даведацца ў вядомага ў беларускім футболе спецыяліста Людаса Румбуціса.**



У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» Людас Ёнавіч паразважаў на тэму трансфераў у міжсезонні, цікавасці гледачоў, складанай фінансавай сітуацыі і пра многае іншае.

## «Спарынгі ні пра што не сведчаць»

*Без сумненняў, Людас Румбуціс — чалавек, які жыве спортам, таму збоку адразу відаць, як ён засумаваў па футболе. Вопытнага спецыяліста можна было бачыць на матчы Суперкубка, а цяпер ён не ўтойвае, што вельмі чакае старту чэмпіянату краіны.*

— У міжсезонне, вядома, сачыў за пераходамі гульцоў, набыткамі клубаў і спарынгамі камандаў. На мой погляд, кола дружын, якія будуць змагацца за чэмпіёнства, акрэслена, гэта БАТЭ і «Шахцёр», у святле апошніх падзей невядома, што чакае мінскае «Дынама». Вельмі спадзяюся, што ўсё будзе добра. Усе гэтыя далёка неспартыўныя праблемы вельмі моцна ўплываюць на асобных гульцоў і на выступленне клуба ў цэлым. Далёка хадзіць не трэба, ёсць прыклад — хакейнае мінскае «Дынама». Хочацца спадзявацца, што ўсё вырашыцца станоўча, я сам адыграў у гэтай камандзе 11 сезонаў, таму «Дынама» — клуб мне не чужы.

У міжсезонні «бела-сінія» дужа абнавіліся, прыбралі легіянерскі вектар, пакінуўшы толькі Умару Бангура і Аляксандру Някша. Сышлі Чыгозе Удоджы і Фатос Бечырай, пад пытаннем застаецца Ненад Адамавіч.

БАТЭ абнавіўся кропкава, на месца Філіпа Младэнавіча ўзялі левага абаронцу Артура Піка. Таксама новымі набыткамі сталі Юрый Кендыш і Мірка Іваніч. Апошні ўжо добра зарэкамендаваў сябе ў матчы за Суперкубак, ды і ў цэлым усе трое вельмі арганічна ўпісаліся ў калектыў.

Што тычыцца майго асабістага меркавання, то мне імпануюць «Нёман» і «Тарпеда-БелАЗ», якія, не спяшаючыся, спрабуюць умацавацца. Астатнія каманды, я б сказаў, жывуць адным днём, яны складуць «масоўку» чэмпіянату.

Хочацца адзначыць, што не варта звяртаць асаблівую ўвагу на спарынгі, якія правялі каманды ў міжсезонне, таму што, як правіла, яны ні пра што не сведчаць.

## «Словамі можна і дровы секчы». Пра піяр «Белшыны» і «Крумкачоў»

*Усё міжсезонне інфармацыйная прастора запаўнялася інтрыгуючымі, а часам і скандальнымі навінамі ад бабруйскага футбольнага клуба. Ці варта балельшчыкам чакаць сюрпрызу?*

— Па свайму вопыту магу сказаць, што ў Літве было шмат падобных спроб з расійскага боку набываць футбольныя клубы. Літоўская федэрацыя футбола бунтавала з гэтай нагоды вельмі моцна і мела рацыю. Пакуль не магу сказаць нічога дрэннага па гэтым пытанні ў нашай краіне, толькі прыводжу прыклад.

«Белшына» на гэты момант — абсалютны кот у мяшку. Зразумець, што адбываецца ў гэтым клубе, вельмі складана. Пакуль мы не маем ніякай інфармацыі пра гаспадара, хто за гэтым стаіць, з чым яны прыйшлі і самае галоўнае — якія гарантыі гатовы даць беларускаму футболу. Калі яны прыйшлі пазмагацца з БАТЭ за чэмпіёнства, то трэба прывезці каманду з прэм'ер-лігі Расіі. Я не думаю, што «Белшына» стане «бомбай» сезона, мы ведаем узровень Булыгі, Канцавога, іншых гульцоў, якія будуць выступаць у гэтым клубе. Адну-дзве гульні пацягацца з БАТЭ яны, мабыць, змогуць, але на ўвесь чэмпіянат іх наўрад ці хопіць. Калі паглядзець на гэтую сітуацыю з іншага боку, то такая дзейнасць клуба ў міжсезонні прыўносіць свайго роду інтрыгу ў беларускі футбол, і гэта добра.

Такая ж сітуацыя з «Крумкачамі»: піяру шмат, у гэтым плане яны малайцы. Паглядзім, што атрымаецца на справе, бо словамі можна і дровы секчы.

## «Сістэмай мы тармазнулі развіццё маладзёжнага футбола»

*Яшчэ адной праблемай беларускага чэмпіянату, якую бурна абмяркоўваюць, з'яўляецца сістэма розыгрышу. Бо тое, колькі камандаў павінна гуляць у Вышэйшай лізе, уплывае не толькі на клубныя справы, але і на развіццё футбола ў краіне ў цэлым. Нагадаем, што ў сёлетнім розыгрышы чэмпіянату будуць удзельнічаць 16 клубаў, турнір пройдзе ў 2 кругі, адбудзецца 30 тураў, якія змесцяць 240 матчаў.*

— Гэты варыянт, на мой погляд, самы лепшы. Растлумачу, чаму. Напрыклад, у БАТЭ ёсць маладыя гульцы, але ўсе, вядома, не могуць праходзіць у асноўны склад. Кіраўніцтва можа аддаваць спартсменаў у арэнду, у тую ж «Іслач», «Гарадзею», «Крумкачы». І маладыя хлопцы там гуляюць, змагаюцца з добрымі камандамі. А калі было 12 клубаў, месца маладым у «вышцы» не было, трэба сыходзіць у першую лігу, а розніца паміж імі адчувальная.

За час, пакуль мы гулялі чэмпіянат 12-ую камандамі, страцілі многіх маладых футбалістаў: на гэта паказвае сёння вынік «маладзёжкі», яны ж нікуды не могуць прабіцца. Такой сістэмай мы тармазнулі развіццё маладзёжнага футбола ў краіне на гадоў 5-7.

## «Патрэбна інтрыга...»

*Завяршэнне мінулага сезона адзначылася спрэчкамі датычных да футбола людзей пра дзеянні супрацоўнікаў праваахоўных органаў у дачыненні да заўзятараў. У пачатку гэтага года спрэчкі працягнуліся і галоўным пытаннем стала — ці павінны міліцыянеры прысутнічаць у чашы стадыёна.*

— Як той казаў: два заўзятары — тры думкі. Калі людзі па-хамску сябе паводзяць і матам крыюць пры дзецях, вядома, хацелася б, каб міліцыя была, але калі ты ідзеш на стадыён і цябе выварочваюць навыварат — гэта не вельмі прыемна. Можна паглядзець на гэтае пытанне з другога боку: калі прысутнічаюць работнікі праваахоўных службаў — мне бяспечней, вось і ўсё. Вядома, ёсць пераборы з абодвух бакоў, нездарма ж былі сустрэчы кіраўніка федэрацыі футбола з міністрам унутраных спраў. Ёсць культура «хварэння», ва ўсім свеце на футбольных стадыёнах шумяць, але не крычаць матам, гэта розныя рэчы.

Вядома, на наведвальнасць уплываюць і іншыя фактары. Самае галоўнае — гэта тое, што павінна быць інтрыга, трэба, каб была барацьба за лідарства. Другое — заўзятару заўсёды больш прыемна хадзіць на стадыён, калі яго каманда выйграе, гэта значыць, павінны быць перамогі. Немалаважным сёння ў спорце з'яўляюцца рэклама і піяр, хацелася б, каб больш пісалі, больш гаварылі, каб футбол заўсёды быў на слыху. Створаны вельмі цікавы праект інтэрнэт-трансляцый чэмпіянату Беларусі, бо немагчыма паездзіць па ўсёй краіне, а, умоўна кажучы, калі я хачу паглядзець, як БАТЭ гуляе ў Брэсце, я спакойна магу гэта зрабіць, гэта выдатна.

Ну і не трэба забываць пра такія дробязі, якія таксама ўплываюць на наведвальнасць: неабходна, каб жонка адпусціла, каб добрае надвор'е было, каб ураджай убралі на дачах ■


Беларуская «класіка»: «Дынама» — БАТЭ. Што будзе ў новым сезоне?

■ Змена

# КАЛІ ВЯРТАЮЦЦА ПЕРАМОГІ

## ЮНІЁРСКІ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА КАНЬКАБЕЖНЫМ СПОРЦЕ ПАКАЗАЎ, ШТО КРАІНА ЗДОЛЬНАЯ ВЫРАСЦІЦЬ НОВЫХ ЖАЛЯЗОЎСКІХ

**Раней канькабежны спорт у Беларусі быў на асаблівым рахунку, менавіта ў гэтым відзе наш прадстаўнік заваяваў адну з першых алімпійскіх узнагарод для самастойнай дзяржавы. Да гэтага часу дасягненні беларускага спартсмена Ігара Жалязоўскага не паўтарыў ніхто, ураджэнец Оршы 6 разоў станавіўся чэмпіёнам свету, на яго рахунку мноства рэкордаў і медалі Алімпійскіх гульняў. Праз нейкі час яго справу ў Беларусі працягвала Анжаліка Кацюга, яна не раз была прызёркай чэмпіянатаў свету, выступала на Гульнях, але да алімпійскага п'едэстала так і не дабралася.**

Пасля гэтых гучных імёнаў у беларускім канькабежным спорце ўтварылася яма: нашы спартсмены толькі замыкалі пратакольныя спісы, не было моладзі, дзяцей і ўмоў. Здаецца, усё пачало змяняцца з прыняццем рашэння аб будаўніцтве ў краіне крытага канькабежнага стадыёна, бо рыхтаваць спартсменаў на адкрытых пляцоўках, ды яшчэ і пры ўмове кароткіх беларускіх зім — утопія.

Сем гадоў таму ў сталіцы з'явіўся новенькі канькабежны стадыён, сёння ён адзін з найлепшых у Еўропе. Неўзабаве вынікі спартсменаў пайшлі ўгору, у 2014 годзе быў пастаўлены шэраг нацыянальных рэкордаў, пачала з'яўляцца перспектыўная моладзь. Сёлета Беларусі ўпершыню даверылі правесці ЧЕ. Нашы суайчыннікі там прадказальна да п'едэстала не дабраліся, але прайшло крыху больш за месяц, і поспех чакаў беларусаў на юніёрскім чэмпіянаце свету. Турнір у кітайскім Чанчуні стаў самым удалым у гісторыі для нашых спартсменаў.

Дзевятнадцацігадовы Ігнат Галавацюк заваяваў званне чэмпіёна свету на дыстанцыі 500 м, разам з тым малады беларус устанавіў новы нацыянальны рэкорд, яго час — 35,72 секунды.

— *Я не чакаў такога поспеху,* — падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» новы чэмпіён, — *ехаў на турнір з 8-м вынікам па асабістых рэкордах, таму з трэнерам разлічвалі трапіць у 5-ку наймацнейшых. Аднак усе зоркі сышліся, і я апынуўся найлепшым. Калі прабег дыстанцыю, Ларыса Уладзіміраўна (асабісты трэнер) сказала, што майго часу будзе дастаткова, каб стаць першым. Да мяне прабеглі 40 чалавек, я апярэдзіў іх на паўсекунды, заставалася 4 пары самых моцных. Я пагледзеў першую, яны мне прайгралі, наступную і тады зразумеў, што сваім часам забіў іх маральна. У гэты момант быў неверагодна рады, ускінуў рукі ўгору і зразумеў — я чэмпіён свету.*


Ігнат ГАЛАВАЦЮК і яго асабісты трэнер Ларыса КАЗАКЕВІЧ.

Гэта не першыя ўзнагароды Ігната ў сёлетнім годзе (на юніёрскім Кубку свету хлопец падымаўся на п'едэстал тройчы). Адзначым, што менавіта так пачынаў свой шлях вялікі Жалязоўскі — у 1982 годзе ён выйграў чэмпіянат свету сярод юніёраў, а пазней дамогся поспехаў у дарослым спорце.

Пасля добрага выступлення ў асабістых забегах наша зборная паказала сваё майстэрства ў камандным спрынце. Хлопцы ў складзе Станіслава Ігнаценкі, Яўгена Болгава і Ігната Галавацюка заваявалі бронзавыя ўзнагароды ■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

# ОАО «Новое стекло»

Учетный номер плательщика: 101180535
Вид экономической деятельности: заготовка вторичного сырья
Организационно-правовая форма: акционерная
Орган управления: Мингорисполком
Единица измерения: млн.руб.
Адрес: 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1317.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 329 | 326 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **329** | **326** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 21 | 40 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 16 | 24 |
| готовая продукция и товары | 214 | 5 | 16 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 2 | 1 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 48 | 90 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **72** | **131** |
| **БАЛАНС** | **300** | **401** | **457** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 38 | 38 |
| Добавочный капитал | 450 | 172 | 162 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (136) | 41 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **74** | **241** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 15 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 312 | 216 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 256 | 179 |
| по налогам и сборам | 633 | 33 | 5 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 5 | 5 |
| по оплате труда | 635 | 4 | 10 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | | 3 |
| прочим кредиторам | 638 | 14 | 14 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **327** | **216** |
| **БАЛАНС** | **700** | **401** | **457** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 1 936 | 1 621 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (485) | (448) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 1 451 | 1 173 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 304) | (1 335) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 147 | (162) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 115 | 957 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (185) | (960) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 77 | (165) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | 5 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | | 5 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | - | (11) |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | | (11) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 150 | - | (6) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150) | 160 | 77 | (171) |
| Налог на прибыль | 170 | (30) | |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200) | 210 | 47 | (171) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 10 | 23 |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 57 | (148) |

Руководитель С.В.Варвашеня
Главный бухгалтер С.Н.Варвашеня

# ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА

УНП 100299678

Полное наименование:
Открытое акционерное общество
# «УНИВЕРСАМ РИГА»

Адрес: *г. Минск, ул. Сурганова, 50, тел./факс 331–80–15*
Ф.И.О. директора: *Кодеба Михаил Гаврилович*
Ф.И.О. гл. бухгалтера: *Черкас Ирина Александровна*
Основной вид деятельности:
*услуги по сдаче в аренду (внаем) собственного или арендуемого недвижимого имущества*
Единица измерения: *млн руб.*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

| Наименование | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 65048 | 66324 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 | 4 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 123 | 99 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 19755 | 13800 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **84929** | **80227** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы (материалы) | 210 | 171 | 67 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 4 | 5 |
| НДС по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | — | 3 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1681 | 1091 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 60 | 1561 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1916** | **2727** |
| **БАЛАНС** | **300** | **86845** | **82954** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 6556 | 6556 |
| Резервный капитал | 440 | 295 | 295 |
| Добавочный капитал | 450 | 63453 | 63453 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 15528 | 11722 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **85832** | **82026** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность: поставщикам | 631 | 88 | 38 |
| по авансам полученным | 632 | 155 | 264 |
| по налогам и сборам | 633 | 460 | 365 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 37 | 36 |
| по оплате труда | 635 | 115 | 107 |
| собственнику имущества | 637 | 158 | 114 |
| прочим кредиторам | 638 | — | 4 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1013** | **928** |
| **БАЛАНС** | **700** | **86845** | **82954** |

**Коды строк баланса с нулевыми показателями не печатаются.*

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2015 год

| Наименование | Код строки | Январь–декабрь 2015 г. | Январь–декабрь 2014 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 16673 | 14433 |
| Валовая прибыль (010–020) | 030 | 16673 | 14433 |
| Расходы на реализацию | 050 | (6887) | (6083) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030–040–050) | 060 | 9786 | 8350 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 4 | 1 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (278) | (238) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070–080) | 090 | 9512 | 8113 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 9 | 30 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100–110+120–130) | 140 | 9 | 30 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 9521 | 8143 |
| Налог на прибыль | 160 | (1751) | (1506) |
| Чистая прибыль (убыток) (±150–160±170±180–190–200) | 210 | 7770 | 6637 |
| Совокупная прибыль (убыток) (210±220±230) | 240 | 7770 | 6637 |

**Коды строк с нулевыми показателями не печатаются.*

**Данные отчетности подтверждены:**
**Аудиторская организация –**
**Общество с ограниченной ответственностью «Аудиторская экспертиза», УНП 191335749**

## К сведению акционеров ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА»:

ВЫПЛАТА ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ РАБОТЫ ЗА 2-Е ПОЛУГОДИЕ 2015 ГОДА будет производиться **8, 11 и 12 апреля 2016 года** с 11.00 до 17.00 по адресу: 220040, г. Минск, ул. Сурганова, 50, 2-й этаж, бухгалтерия.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Витебский завод электроизмерительных приборов» (продавец)**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:**

**Лот № 1:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-50253 | Производственный корпус № 3 (в т.ч. кран-балка, инв. № 143798) | 808,5 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/1 |

**Начальная цена с НДС 20% – 2 192 303 390 бел. руб. (снижена на 40%)**

**Лот № 2:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-43676 | Корпус № 7 (складской) | 521 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/3 |

**Начальная цена с НДС 20% – 417 600 000 бел. руб. (снижена на 40%)**

**Лот № 3:**

**База отдыха «Вышедки», расположенная по адресу: Витебская область, Городокский район, Стодолищенский с/с, 0,5 км южнее д. Вышедки, 1, в составе:**

| № п/п | Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь (кв.м) |
|---|---|---|---|
| 1 | 201/С-10553 | корпус № 1 | 52 |
| 2 | 201/С-10554 | корпус № 2 | 51,3 |
| 3 | 201/С-10555 | корпус № 3 | 51,7 |
| 4 | 201/С-10556 | корпус № 4 | 51,2 |
| 5 | 201/С-10557 | корпус № 5 | 50,9 |
| 6 | 201/С-10558 | корпус № 6 | 52 |
| 7 | 201/С-10559 | корпус № 7 | 75,3 |
| 8 | 201/С-12691 | здание неустановленного назначения | 23 |
| 9 | 201/С-12692 | туалет | 3,1 |

А также: воздушная линия электропередачи ВЛ-10 кВ, протяженность 945 м.п., инвентарный номер 201/С-12702, с трансформаторной подстанцией КТП; наружное освещение, инвентарный номер 201/С-12689

**Начальная цена с НДС 20% – 523 295 760 бел. руб. (снижена на 35%)**

**Лот № 4:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-78931 | Склад | 487,5 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/2 |

**Начальная цена с НДС 20% – 2 303 666 880 бел. руб.**

**Сведения о земельных участках:** лоты № 1–2, 4 расположены на земельном участке пл. 3,1357 га, предоставленном в общую долевую аренду по 10.04.2065, для содержания и обслуживания производственных помещений.

Лот № 3 расположен на земельном участке площадью 1,9683 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для использования под базу отдыха. Земельный участок пл. 1,0141 га предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания воздушной линии ВЛ-10. Земельный участок пл. 0,0293 га, предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания КТП-568. Земельные участки имеют ограничения в пользовании – водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Вышедское

**Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты недвижимости производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

*Предыдущее извещение о проведении аукциона по Лотам №1–3 опубликовано в газете «Звязда» от 20.01.2016.*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Аукцион состоится **25.04.2016 года в 14.00** по адресу: г. Витебск, ул. Ильинского, 19/18, корпус № 8, 3-й этаж, помещение 309, ОАО «ВЗЭП». Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.04.2016 года до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71. auction@cpo.by. www.cpo.by.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О РЕАЛИЗАЦИИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ОАО «Барановичидрев» на первых торгах 25.04.2016 года

**Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит первые торги в форме аукциона по реализации объекта недвижимости,**

## здание специализированное, капитальное строение – МАЛЯРНЫЙ ЦЕХ,

**инв. №000282, пл. 1.471 м²**

Конт. телефон: тел. 8-029-6332490 vel.; (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; E-mal: mischuk_am@mail

**Торги состоятся 25 апреля 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3.**

**Лот №7 – объект недвижимости, расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость – 1.422.273.600 рублей, без НДС.**

Сумма задатка: 10% от начальной цены лота в рублях РБ
Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-СберБанк», код 369, г. Барановичи.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, **в срок до 14 часов 00 минут 20.04.2016 г.** организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: **225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3, ОАО «Барановичидрев».**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры **с 25.03.2016 года.**

**Председатель ликвидационной комиссии ОАО « Барановичидрев» А.М.МИЩУК**

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2015 год**

# ОАО «Радиан-ЗСА»

**г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, к. 213, УНП 100026874**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

| АКТИВ | Сумма, млн руб. | ПАССИВ | Сумма, млн руб. |
|---|---|---|---|
| **I. Долгосрочные активы** Основные средства | 449 | **III. Собственный капитал** Уставный капитал | 18 |
| Нематериальные активы | 1 | Резервный капитал | 14 |
| Доходные вложения в материальные активы | - | Добавочный капитал | 448 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | - | Нераспределенная прибыль | 289 |
| **Итого по разделу I** | **450** | **Итого по разделу III** | **769** |
| **II. Краткосрочные активы** Запасы | 25 | **IV. Долгосрочные обязательства** Прочие долгосрочные обязательства | - |
| В том числе – материалы | 25 | | |
| Прочие запасы | - | **V. Краткосрочные обязательства** | |
| Расходы будущих периодов | 10 | | |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам | - | Краткосрочная кредиторская задолженность | 103 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 186 | В т.ч. по поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 5 |
| Краткосрочные финансовые вложения | - | По авансам полученным | 2 |
| | | По налогам и сборам | 22 |
| Денежные средства и эквиваленты | 201 | По социальному страхованию и обеспечению | 39 |
| Прочие краткосрочные активы | - | По оплате труда | 34 |
| | | Прочим кредиторам | 1 |
| **Итого по разделу II** | **422** | **Итого по разделу V** | **103** |
| **БАЛАНС** | **872** | **БАЛАНС** | **872** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2015 года по 31 декабря 2015 года

| Наименование показателя | Сумма, млн руб. | Наименование показателя | Сумма, млн руб. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 1184 | Расходы по финансовой деятельности | - |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | (864) | В том числе проценты к уплате | - |
| Валовая прибыль | 320 | Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 25 |
| Управленческие расходы | (56) | | |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 264 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 289 |
| | | Налог на прибыль | - |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 264 | Прочие налоги, исчисляемые из прибыли | - |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 25 | Чистая прибыль (убыток) | 289 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | - | Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | - |
| Доходы от участия в уставном капитале других организаций | - | Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль | - |
| проценты к получению | 25 | Совокупная прибыль (убыток) | 289 |
